# У Савеце Саюза

## Прамова дэпутата П. К. ПАНАМАРЭНКІ

(Мінская сельская выбарчая акруга, Беларуская ССР)

Таварышы дэпутаты! Палажэнне аб Камісіі заканадаўчых меркаванняў Савета Саюза, праект якога Камісія заканадаўчых меркаванняў унесла на разгляд Савета Саюза, будзе мець вялікае значэнне ў пашырэнні і ўзмацненні заканадаўчай дзейнасці Вярхоўнага Савета СССР, які з'яўляецца вышэйшым органам дзяржаўнай улады ў нашай краіне. Згодна артыкула 32 Сталінскай Канстытуцыі Вярхоўны Савет СССР выключна ажыццяўляе заканадаўчую ўладу ў СССР.

Савецкая сістэма гаспадаркі і кіравання пабудавана так, каб у максімальнай ступені забяспечыць інтарэсы працоўных, гарантаваць усё новы і магутны росквіт сіл сацыялістычнага грамадскага ладу, усё большы рост і ўмацаванне магутнасці нашай вялікай Радзімы. Гэтым мэтам служаць законы Саюза ССР, якія адыгрываюць велізарную ролю ў правядзенні ў жыццё палітыкі савецкага ўрада, у рэгуліраванні і накіраванні ўсяго гаспадарча-палітычнага жыцця краіны ў інтарэсах будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Савецкая дзяржава з'яўляецца выражэннем вышэйшай формы дэмакратыі, якая толькі магчыма. Яна прадстаўляе з сябе велізарную сілу арганізацыі, выхавання, навучання, культурнага росту народных мас. Вялікая Сталінская Канстытуцыя, зарэгістраваўшая ў заканадаўчым парадку сусветна-гістарычныя перамогі сацыялізма, да канца раскрывае сутнасць сацыялістычнага дэмакратызма, які з'яўляецца прамым вынікам трыумфа дыктатуры рабочага класа і вынікам развіцця савецкага сацыялістычнага дзяржаўнага ладу.

Савецкая дзяржава і Канстытуцыя (Асноўны Закон) Саюза ССР стаяць на варце ўмацавання і развіцця савецкага дэмакратызма, які забяспечвае для ўсіх народаў нашай Радзімы актыўны ўдзел у палітычным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

Сталінская Канстытуцыя надае важнейшае значэнне сацыялістычнаму закону, што вынікае з велізарнай узлзейнічаючай ролі савецкай дзяржавы ў справе завяршэння будаўніцтва бескласавага сацыялістычнага грамадства ў нашай краіне і паступовага пераходу ад сацыялізма да камунізма.

У капіталістычным грамадстве закон выражае волю пануючага буржуазнага класа, г. зн. дыктатуры нікчэмнай меншасці над большасцю. У буржуазным грамадстве закон стаіць на варце інтарэсаў капіталістычнай прыватнай уласнасці, на варце эксплаататарскай сістэмы.

У савецкім грамадстве закон ёсць вышэйшы акт дзяржаўнай улады, які адпавядае інтарэсам найшырэйшых мас народа. Ён ахоўвае інтарэсы пераважнай большасці насельніцтва—працоўных, скінуўшых капіталістаў і памешчыкаў і пабудаваўшых сацыялістычнае грамадства, у якім няма эксплаатацыі чалавека чалавекам.

Такая карэнная прынцыповая розніца паміж савецкай і буржуазнай законнасцю ярка паказвае перавагу і прагрэсіўнасць нашай савецкай сацыялістычнай законнасці, рэальнасць якой забяспечваецца аўтарытэтам выбранай самім народам вышэйшай улады. Яна выдае законы, падтрымліваемыя найшырэйшымі масамі працоўных і правадзімыя самім народам у жыццё.

У сацыялістычных законах знаходзіць сваё поўнае выражэнне воля савецкага народа. Вярхоўны Савет СССР—вышэйшы орган дзяржаўнай улады СССР, ажыццяўляючы на аснове праваў, прадастаўленых артыкулам 14 Сталінскай Канстытуцыі, заканадаўчую ўладу, тым самым поўнасцю і безраздзельна ажыццяўляе суверэнітэт савецкага многанацыянальнага народа.

З гэтага велізарнага значэння савецкага закона і сацыялістычнай законнасці вынікае неабходнасць стараннай, папярэдняй падрыхтоўкі законаў для пастаноўкі іх на абмеркаванне і зацверджанне ў Палатах Вярхоўнага Савета СССР. Да выканання гэтых важнейшых задач заклікаты створаныя пастаянныя Камісіі заканадаўчых меркаванняў Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Камісія заканадаўчых меркаванняў Савета Саюза была ўтворана пастановай Савета Саюза другога склікання на 1 сесіі 18 сакавіка 1946 года. За прайшоўшы час Камісія заканадаўчых меркаванняў прарабіла значную работу па папярэдняму разгляду раду законапраектаў, якія падрыхтоўваюцца для ўнясення на зацверджанне Вярхоўнага Савета СССР.

Разам з гэтым трэба сказаць, што ўсё больш поўнае ажыццяўленне Вярхоўным Саветам сваёй заканадаўчай дзейнасці і пашырэнне яе,—а гэта вынікае з задач палітычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў цяперашніх пасляваенных умовах развіцця нашай краіны,—намнога ўзмацняе значэнне папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі законапраектаў. Гэта запатрабуе ад Камісіі заканадаўчых меркаванняў больш інтэнсіўнай і планамернай



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы